2. Литовский Центральный государственный архив (LCVA). – Ф. 53. – Оп. 23. – Д. 810. Отчеты о политической и общественной жизни в Вильно и воеводстве (июль – декабрь 1925 г.).
3. Holzer, J. Mozaika polityczna II Rzeczypospolitej / J. Holzer. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1974. – 670 s.
4. Государственный архив Брестской области (ГАБО). – Ф. 2001. – Оп. 4. – Д. 1627. Месячные и еженедельные донесения полиции и гмин о происшествиях на территории Пинского повета (1924 г.).
5. LCVA. – Ф. 53. – Оп. 23. – Д. 811. Отчеты о политической и общественной жизни в Вильно и воеводстве (1926 г.).
6. LCVA. – Ф. 53. – Оп. 23. – Д. 805. Окольник Делегата правительства на Виленской земле в деле деятельности политических течений на территории Виленского воеводства (1925 г.).
7. ЗГАМО. – Ф. 4. – Оп. 1. – Д. 626. Месячные отчеты о морально-политическом состоянии Ошмянского повета (30.01 – 31.10.1924 г.).
8. LCVA. – Ф. 53. – Оп. 23. – Д. 310. Отчет Виленского городского староства за 1925 г.
9. ЗГАМО. – Ф. 10. – Оп. 1. – Д. 17. Список заподозренных в коммунистической деятельности (1923 г.).
10. LCVA. – Ф. 119. – Оп. 1. – Д. 147. Отчет о деятельности партий и организаций на территории Новогрудского повета (1924 – 1926 гг.).
11. ЗГАМО. – Ф. 93. – Оп. 1. – Д. 8. Дело о борьбе с рабочим, демократическим и национально-освободительным движением.

УДК 32001

# ГІСТАРЫЧНЫЯ ВЕДЫ І ПАЛІТЫЧНЫ ВЫБАР

**В.У. Галубовіч**
УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт"
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

The problem of polittical forming amond students is considered in this aticl. The conclusion about insufficiency of use of national history potrntial in political science is made.

Падставай для прапанаваных ніжэй развагаў стаў досвед выкладання паліталогіі і сумежных паліталагічных дысцыплін. Неаднаразовыя намаганні па "ідэнтыфікацыі" палітычных арыенціраў, ідэалаў, каштоўнасцей у студэнтаў рана ці позна выводзілі нас на разуменне і інтэрпрэтацыю навучэнцамі праблем і тэмаў сумежных навук. Спробы дакапацца да "генеалогіі" стракатай палітры перакананняў заканамерна прыводзілі і да абмеркавання не толькі сучасных праблем, але таксама розных гістарычных фактаў і працэсаў, па адзнацы і характарыстыцы якіх у цэлым назіраецца дыферэнцыяцыя палітычных поглядаў. На шмат складаней справа выглядае з іншымі галінамі ведаў.

Хацелася б пачаць з банальнай тэзы пра тое, што паліталогія



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

шчыльна звязана з цэлым шэрагам гуманітарных навук: правазнаўствам, філасофіяй, гісторыяй, псіхалогіяй, сацыялогіяй, эканомікай, дыпламатыяй. Паліталогія, судатыкаючыся з кожнай асобнай навукай, бярэ для сябе тое, што наўпрост ці ўскосна датычыцца палітыкі. Гэта не азначае, што паліталогія прэтэндуе на пэўную гегемонію, але сведчыць пра яе апрыёрную інтэрдысцыплінарнасць, гнуткаць і ў пэнай ступені энцыклапедычнасць. Калі кожны выпадак перакрыжавання палітычнай навукі разглядаць паасобку, то не складана заўважыць, што яе залежнасць ад пералічаных навук не будзе сіметрычнай. Рацыянальна падыходзячы да справы, галінай ведаў, у найбольшай ступені звязанай з палітычнай навукай, трэба лічыць правазнаўства. На нашу думку, палітычная практыка, а паліталогія скіравана, у першую чаргу, на яе, найперш накіравана на прыняцце норм рэгулюючых розныя аспекты жыцця грамадства і функцыянавання дзяржавы. Бадай, складана адшукаць раздзел паліталогіі як навучальнай дысцыпліны не звязаны з правам. Юрыдычныя асновы палітычнай навукі ў сучасным яе выглядзе бяспрэчныя, але гэта не азначае, што добры юрыст можа стаць някепскім палітыкам ці нават палітолагам. Тым не менш, трэба дапусціць, што юрысты ў большай ступені, чым іншыя прафесійныя групы, зарыентаваныя ў прававых, г. зн., палітычных механізмах функцыянавання грамадства. Адпаведная адукацыя дазваляе юрыстам выступаць і ў якасці знаўцаў важнейшых пытанняў функцыянавання палітычнай сістэмы. Але падаўляючая большасць грамадзян не мае спецыяльнай юрыдычнай падрыхтоўкі. Прававы нігілізм тыповая з'ява сярод розных катэгорыяў грамадзян, у тым ліку і з вышэйшай адукацыяй. Не менш надзейнай асновай, чым права, для паліталогіі заўсёды была філасофія: канструкцыі Платона і асабліва арыстоцелеўская "Палітыка" сталі зыходнім пунктам станаўлення сусветнай палітычнай думкі. На жаль, а магчыма, на шчасце, любоў да мудрасць не кожнаму па глузду і па кішэні, а вывучаць філасофію, не азначае яе ведаць, тым больш усведамляць практычную карысць ад гэтых ведаў, асабліва ў сферы палітыкі. Сістэмнае вывучэнне філасофіі адбываецца толькі ў ВНУ, гэта значыць, у час, калі ўжо адбыўся працэс пачатковай палітычнай сацыялізацыі і некаторая частка студэнтаў сфармавала сваё стаўленне да палітыкі. Для падаўляючай жа большасці студэнтаў нашага універсітэта міждысцыплінарныя сувязі паміж паліталогіяй і філасофіяй пачынаюцца і сканчваюцца на гісторыі філасофіі.

Не спыняючыся на ўзаемадачыненнях з іншымі вышэйпералічанымі навукамі, паспрабуем паразважаць над тым, як



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

засваенне асноваў палітычнай навукі, у сэнсе, навучальнай дысцыпліны, прадвызначаецца менавіта гісторыяй, паколькі ні адна з грамадскіх навук так комплексна і так паслядоўна, як гісторыя не фармуе, да пэўнага ўзросту, грамадзянскія каштоўнасці. Вывучэнне гісторыі, у адрозненні ад філасофіі ці права, прадугледжваецца школьнай праграмай. Менавіта так званая "***настаўніца жыцця***" нясе ільвіную долю адказнасці за фармаванне палітычных поглядаў ці іх актыўную дэфармацыю. Хаця ўсё спісваць толькі на гісторыю не прыходзіцца. Важную працу ў фармаванні грамадзянскіх ідэалаў выконвае і літаратура, прадстаўляючы гатовыя і прэпараваныя крытыкай тыпы і мадэлі паводзінаў герояў, іх адносінаў да розных сфераў жыцця, у тым ліку да палітыкі. І калі б мы задумалі скласці сукупны вобраз героя ці гераіні (а яшчэ лепш, "пантэону" такіх літаратурных персанажаў) беларускай літаратуры XIX ст. ці нават XX ст., то, магчыма, заўважылі б многія латэнтныя наступствы ўздзеяння *айчыннага мастацкага слова* на працэс палітычнай сацыялізацыі асобы. Дарэчы, не менш цікавыя высновы можна чакаць і ад вынікаў даследавання залежнасці палітычнага выбару ад арыентацыі на пэўныя літаратурныя плыні ў сучасным пісьменстве, у тым ліку і айчынным. Але вернемся да гісторыі.

На наш погляд, брак інтарэсу да палітыкі напрасткі вынікае з слабой арыентацыі, у першую чаргу, у айчыннай, а таксама і сусветнай гісторыі. Прычыны ж нігілістычнага стаўлення да ўласнай мінуўшчыны даўно вядомыя, і шукаць іх трэба ў асаблівасцях гістарычнай палітыкі, якая праводзілася на Беларусі напрацягу некалькі апошніх стагоддзяў. Вядомы нямецкі даследчык Райнэр Ліндэр цалкам слушна падкрэсліў у прадмове да беларускага выдання сваёй працы, прысвечанай нацыятворчым працэсам на Беларусі ў XIX-XX стст.: "*Гісторыкі – гэтаксама як пісьменнікі ды публіцысты – належаць да інтэрпрэтацыйнай эліты, паслугамі якой панавальны ўладны рэжым карыстаецца перадусім тады, калі яго гістарычная альбо актуальная легітымнасць знаходзіцца пад пытаннем. У гісторыі XX ст. шмат прыкладаў таго, як узнікае таталітарны рэжым, як ён рэгенеруецца і якое месца ў яго ўмацаванні адыгрываюць ідэалогіі, сімвалы і вобразы гісторыі.*" [2, с. 7]. На жаль, гісторыя не толькі была раней, але і надалей, як вядома, застаецца на ўзбраенні тых, хто звыкся ў прамым значэнні слова "*філасофстваваць молатам*". Калі ж пагадзіцца з тым, што гістарычныя веды з'яўляюцца магутным фактарам уплыву на масавую свядомасць і выступаюць у якасці пратапласты для ўзнікнення палітычных арыенціраў грамадзяніна, то нескладана заўважыць намаганні ўсіх рэжымаў, што



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

змянялі адзін аднаго ў мінулым, карыстацца надзейным механізмам карэкцыі палітычных настрояў у грамадстве. Не сакрэт, што на тэрыторыі сучаснай Беларусі існуе некалькі ўзроставых катэгорыяў насельніцтва, гістарычныя versus палітычныя ўяўленні якіх не толькі не прадугледжваюць пераемнасці, але і адкрыта супярэчаць адно аднаму. Бездань існуе паміж тымі, хто атрымліваў адукацыю да 1980-х гадоў, тымі, хто навучаўся ў 1990-я гады і ў першыя дзесяцігоддзі XXI ст. Істотным з'яўляецца разрыў паміж тымі, хто атрымліваў гістарычныя веды ў школе да і пасля міленіюму. Гэта не азначае, што сучасная моладзь такая ж малаабазнаная ў айчыннай гісторыі, як класічны савецкі беларус, але яна па-ранейшаму застаецца носьбітам тых уяўленняў, што пашыраліся раней і працягваюць навязвацца зараз. У другой палове 90-х гадоў мінулага і асабліва ў пачатку бягучага стагоддзя школьнае навучанне адчула вяртанне савецкіх і нават заходнерускіх інтэрпрэтацый нацыянальнай гісторыі, што пашырыла *неадназначнае* стаўленне да мінулага, што азначае недавер. Як паказваюць назіранні, палітычныя погляды добра карэлююцца з адносінамі да гісторыі. Прыхільнікі левых і панславісцкіх ідэяў, як правіла, слаба арыентуюцца за межамі падзей XX ст., прыхільна ставяцца да савецкіх пераўтварэнняў. Яны часцей дэманструюць канфармістычны тып паводзінаў. Больш абазнаныя ў айчыннай гісторыі студэнты, звычайна, нацыянальна арыентаваныя і не схільныя, па меншай меры на словах, да палітычнай лаяльнасці. Абедзвум арыентацыям, як выяўляецца, адпавядае і свая інтэрпрэтацыя мінулага. Разам з тым, у грамадскай свядомасці напрацягу апошняга дзесяцігоддзя адбыўся важны пералом: атаясамленне з дзяржавай – Рэспублікай Беларусь – зараз больш відавочная, чым у пачатку 1990-х гадоў, а вось цікавасці да гісторыі становіцца менш. Гэта відаць на накладах і колькасці гістарычных часопісаў, якія маюць статус агульнарэспубліканскіх і дзяржаўнае фінансаванне. Напрыклад, наклад часопіса "Спадчына", які выдаваўся пры падтрымцы Беларускага фонду культуры і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у 1993 г., вагаўся ў памерах 8-10 тысячаў асобнікаў, а праз дзесяць гадоў рэдакцыя як выдавец часопіса пазначае наклад у памеры 750-1300 асобнікаў [4]. Ці гісторыкі зрабілі ўжо сваю справу, і больш не патрэбныя? Ці можа ім ужо вызначана нейкая іншая задача? Зразумела, што так.

У нашым грамадстве многа кажуць пра любоў да Бацькаўшчыны, шанаванне яе гісторыі і культуры. Складана знайсці студэнта, які б сказаў, што шчыра не шануе Айчыны, хаця і такія сустракаюцца. Але ці можна сапраўды любіць тое, што выклікае



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

толькі павагу, але не цікавасць? Ці можна нешта любіць і не цікавіцца гэтым? Гісторыя, як вядома, – палітыка мінулага. Стаўленне да мінулага аўтаматычна пераносіцца ў большасці людзей і на сучаснасць. Калі не выклікае інтарэсу тое, што было, то чаму ж іначай будзе з сучаснасцю. Атрымліваецца, што гісторыя сапраўды нічому не вучыць, альбо большасць мае нейкую "прышчэпку" ад яе. Што праўда, тут прыгадваюцца словы знакамітага мысляра Ф. Ніцшэ: "*гістарычнае і негістарычнае аднолькава карысна для здароўя асобнага чалавека, народа і культуры*" [3, с. 24]. Вельмі складана, не ведаючы пра палітыку мінулага, прэтэндаваць на разуменнь сутнасці сучасных палітычных працэсаў. Аднак жа, такія сітуацыі сустракаюцца часта. Самі палітыкі да традыцыі ставяцца інструментальна.

Грунтоўны аналіз асаблівасцяў расійскай палітычнай культуры выявіў, што ў яе аснове ляжаць такія блізкія, улюблёныя і зразумелыя для шэраговага беларускага грамадзяніна з'явы, як аўтарытарызм, этатызм, патэрналізм, пасіўнасць насельніцтва і прававы нігілізм [1, с. 8]. Не трэба быць вялікім адкрывальнікам, каб не заўважыць магутны ўплыў інтэграцыі на нашых суайчыннікаў, узровень палітычнай культуры якіх адпавядае глыбокай расійскай правінцыі. Да пералічаных адметнасцяў трэба яшчэ дадаць здзіўляльную антырэлігійнаць ці нейкае стыхійнае паганства ў горшым сэнсе слова. Улічваючы такія рысы палітычнай культуры, стаўленне моладзі да палітыкі ёсць сведчаннемне не толькі запаволенай мадэрнізацыі, ці асаблівасці нацыятворчага працэсу, але і вынік мэтанакіраванай палітыкі ў галіне гісторыяпісання, часткай якой стала распаўсюджванне сярод беларусаў ***расійскіх палітычных (гістарычных) міфаў і стэрэатыпаў***. Адбываецца гэта за кошт элімінацыі ўласнай гістарычнай памяці насельніцтва Беларусі.

Нарэшце, трэба адзначыць, што беларуская гісторыя з'яўляецца бясконцай крыніцай звестак па ўсіх праблемах паліталагічнай праблематыкі. Калі некаму падасцца нестасоўным ці некарэктным вывучэнне палітыкі праз мінулае, то адказаць можна на гэта наступным чынам: любая праблема, калі яе не разглядаць у футурыстычным свеце, ужо ёсць частка мінулага. Амаль усе працэсы і з'явы ў палітыцы, якія мы абмяркоўваем ужо адбыліся, а палітычнае прагназаванне – справа непрадказальная і неўдзячная. Так ці іначай прыходзіцца канстатаваць, што для падаўляючай большасці студэнтаў адкрыццём пасля гадоў вывучэння гісторыі з'яўляецца шчыльная залежнасць сучаснасці ад мінулага. Для прыкладу можна ўзяць такую традыцыйную паліталагічню праблему, як палітычная сістэма і яе інстытуты. Выкарыстанне схемы класічнага аналіза палітычнай



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

сістэмы прынцыпова магчыма для многіх перыядаў айчыннай гісторыі, але як гэта ажжыцявіць, калі веды па гісторыі абмяжоўваюцца за цэлыя стагоддзі толькі некалькімі датамі ці імёнамі. Што можна растлумачыць пра сучаснае становішча, ідэалагічныя арыенціры і практычныя мэты сучасных палітычных партый без ведання іх перадгісторыі? Ды і сам нацыянальны "беларускі праект" немагчыма ўявіць без Беларускай сацыялістычнай грамады, створанай на пачатку XX ст. Толькі жывыя прыклады з даўняй і нядаўняй гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў стане пабуджаць развагі пра яе сучасная праблемы і перспектывы ў будучым. Кожны палітолаг ці выкладчык паліталогіі цудоўна ўсведамляе месца ў палітычным жыцці краіны заканадаўчай улады, але, здаецца, ні адзін беларускі падручнік па "Паліталогіі" ніяк не згадвае пра эвалюцыю прадстаўнічых устаноў на беларускіх землях. Пры багацейшых традыцыях параламентарызма, мы свядома нашу моладзь вымушаем згадваць пра англійскій парламент, забываючы пры гэтым соймы часоў Вялікага княства Літоўскага. Беларускай паліталогіяй застаецца незапатрабаваны вялізны пласт даследаванняў, створаных на пачатку XX ст. у Расіі і на пачатку XXI ст. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне.

Падсумоўваючы, адзначым, што гістарычныя веды з'яўляюцца магутным фактарам у фармаванні палітычных арыентацый. Палітычная навука павінна актыўней абапірацца на вопыт нацыянальнай гісторыі, паколькі "*толькі дзякуючы здольнасці выкарыстоўваць мінулае для жыцця і былое ізноў ператвараць у гісторыю, чалавек становіцца чалавекам* "[3, с. 25], а чалавек з пашпартам у грамадзяніна сваёй краіны.

Літаратура


1. Козлов, Н.Д. Политические культуры регионов России: управление со многими неизвестными // ПОЛИС. – 2008.– № 4 (106).– С. 8-26.
2. Лінднэр, Р. Гісторыкі і ўлада. Нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі ў XIX – XX ст./ Пер. з ням. Л. Баршчэўскага; нав. рэд. Г. Сагановіча.– СПб.: Неўскі прасцяг, 2003.– 540 с.
3. Ницше, Ф. О пользе и вреде истории для жизни; Сумерки кумиров; Утренняя заря: Сборник / Пер. с нем.; Худож. обл. М.В. Драко. – Мн.: ООО «Попурри» , 1998. – 512 с.
4. Спадчына.– 1993.– №1-6; 2003.– №1-6.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ